Конкурс сачыненняў “Мая Радзіма – Беларусь”,
Мінская вобласць,
Бондар Даніiл,
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Гімназія № 3 г. Барысава”, 6 “В” клас

# Мая Радзіма - Беларусь

Прыгожая, незалежная, чыстая, шчырая, міралюбівая, магутная, багатая, міласэрная, зялёная, чароўная, а галоўнае, свая, родная, самая любімая мая Радзіма - Беларусь.

Люблю цябе бязмежна, мая Бацькаўшчына! Думаю, што ўсе гэтыя пачуцці ўліліся ў мяне з самага маленства праз матчыны казкі, бабуліны спевы, бацькавы смешныя гісторыі, праз аповеды маіх дзядоў пра жыццё.

Люблю нашу родную мову, такую пяшчотную і мілагучную. Беларускія словы трэба ўдыхаць не спяшаючыся, прыслухоўваючыся да кожнага адцення, кожнага паўтона. Матчына мова - гэта мелодыя нашага краю, скарбніца нашай душы. Гаворыш некаторыя словы: вясёлка, дзьмухавец, матуля, бусел, кветка, крынічка, шчырасць - і адразу ўсмешка асвятляе твой твар. У нашай мове быццам чуюцца перашэпты бярозавых гаёў з дубравамі, размовы красак, нібыта валошкі расказваюць званочкам пра радаснае світанне над жытнёвым полем, пра шчасце жыць на сваім родным полі. Кожнае слова такое іскрыстае, зіхатлівае, ёмістае і насычанае! Гэта чароўная мелодыя маёй роднай мовы назаўсёды ўзяла мяне ў палон сваім хараством і таямнічасцю. Дзякуй нашым продкам, што перадалі нам такі духоўны скарб. Нізкі паклон вам, прашчуры!

“Прырода - найцікавейшая кніга”, - гэтыя словы належаць майму любімаму беларускаму пісьменніку Якубу Коласу. Мы з сям’ёй любім падарожнічаць па сваёй краіне і гартаць старонкі гэтай захапляльнай кнігі: Белавежская пушча, Бярэзінскі запаведнік, Налібокі, задумлівыя Браслаўскія азёры, празрыстая Нарач, Аўгустоўскі канал. Асаблівая ўдача - сустрэць дзікіх звяроў падчас дарогі. Бачылі вялізнага лася, які нетаропка пераходзіў шасэ. Уздоўж дарогі было невялічкае балотца, а на ім частаваліся два ласі. А гарэзлівых касуль сустракаем часцей за ўсё. Як у казцы! З кожнай вандроўкі вяртаешся дадому новым чалавекам, бо прырода выхоўвае нас сваёй прыгажосцю, адкрытасцю, у яе мы вучымся чалавечнасці і спагадзе.

А яшчэ мая Радзіма славіцца людзьмі. Мы ганарымся вольналюбівай Рагнедай, апякункай зямлі беларускай Ефрасінняй Полацкай, славутым першадрукаром Францыскам Скарынам, майстрамі слова. Беларусаў паважаюць ва ўсім свеце. Наш народ працавіты, таленавіты ва ўсім. Краіна майстроў - часта можна пачуць пра Беларусь. Беларус заўсёды працягне руку дапамогі другому. Мы добрыя сябры. Але “з нявыцертымі ботамі не запрашаем на парог“. Калі прыйшоў з дрэннымі намерамі, то не чакай нічога

добрага. Гэта наша зямля! Чужога нам не трэба, але свайго мы нікому і ніколі не аддадзім!

А яшчэ людзі маёй краіны паважаюць і захоўваюць свае традыцыі, бо без ведання мінулага не пабудуеш шчаслівую будучыню. А мы хочам, каб з кожным годам краіна станавілася больш магутнай і прыгожай.

Дрэва расце з каранёў, а Чалавек пачынаецца з вернасці сваёй Радзіме, з пашаны да сваёй спадчыны. Я зычу сваёй Радзіме працвітання, развіцця ва ўсіх галінах, каб кожны беларус быў шчаслівы і па-сапраўднаму любіў і шанаваў сваю маці-краіну. Гаворыш Беларусь - і вырастаюць крылы, бо ты частка нашага мудрага народу. Беларусь знаходзіцца ў самым цэнтры Еўропы, а яшчэ Беларусь знаходзіцца ў самым сэрцы кожнага беларуса, бо гэта наша душа.